ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад дырэктара
дзяржаўнай установы адукацыі
«Грычынская базавая школа»
_____________ №________

# План работы
# дзяржаўнай установы адукацыі «Грычынская базавая школа» на 2024/2025 навучальны год

Разгледжана на педагагічным савеце
Пратакол ад _________ № _____

**Змест**

Раздзел 1. Аналіз вынікаў дзейнасці ўстановы адукацыі за 2023/2024 навучальны год. Вызначэнне адзінай педагагічнай праблемы, мэты і задач дзейнасці на новы 2024/2025 навучальны год…………………………………..……..…………3
I. Аналіз вынікаў дзейнасці дзяржаўнай установы адукацыі “Грычынская базавая школа” за 2023/2024 навучальны год……3
II. Мэты і задачы дзейнасці ўстановы адукацыі на 2024/2025 навучальны год……………………………………………12
III. Планаванне дзейнасці ўстановы адукацыі  на 2024/2025 навучальны год……………………………………………14
Раздзел 2. Працэс упраўлення ўстановай адукацыі……………………………………………………………………………..14
Раздзел 3. Арганізацыйна-педагагічнае забеспячэнне атрымання навучэнцамі агульнай сярэдняй адукацыі…………..........31
Раздзел 4. Арганізацыя выхаваўчай работы …………………………………………………………………………………….37
Раздзел 5. Забеспячэнне сацыяльна-педагагічнай падтрымкі і псіхалагічнай дапамогі навучэнцам…………………………..56
Раздзел 6. Работа з педагагічнымі кадрамі………………………………………………………………………………………57
Раздзел 7. Арганізацыя работы ўстановы ў летні перыяд у дашкольных групах яслей-сада……..…………………………59
Раздзел 8. Псіхолага-педагагічнае і медыка-сацыяльнае суправаджэнне адукацыйнага працэсу…..…………………………62
Раздзел 9. Фінансава - гаспадарчая дзейнасць установы…………………………………………………………………….63

## Раздзел 1.Аналіз вынікаў дзейнасці ўстановы адукацыі «Грычынская базавая школа» за 2023/2024 навучальны год

### I.Аналіз вынікаў дзейнасці дзяржаўнай установы адукацыі за 2023/2024 навучальны год.

У 2023/2024 навучальным годзе дзейнасць установы адукацыі была накіравана на ўдасканаленне сістэмы прафесійна-асабістага росту педагогаў для забеспячэння эфектыўнасці адукацыйнага працэсу.

Працуючы на праблеме павышэння якасці адукацыі, педагагічны калектыў вырашаў наступныя задачы: спрыяць павышэнню прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў на пытаннях сучаснага зместу адукацыі, выкарыстання эфектыўных сучасных тэхналогій і методык выкладання, укаранення ў адукацыйны працэс інавацыйных тэхналогій навучання; арганізаваць мэтанакіраваную і  планамерную працу па падрыхтоўцы вучняў да алімпіяд і ўцягванні іх у праектна-даследчую дзейнасць, з наступным аналізам вынікаў; стварыць умовы для абагульнення і распаўсюджвання станоўчага педагагічнага вопыту творча працуючых настаўнікаў праз арганізацыю ўзаеманаведвання вучэбных заняткаў, публікацый майстар-класаў, праз правядзенне метадычных і прадметных тыдняў, удзелу у семінарах, конкурсах прафесійнага майстэрства, праз павышэнне адказнасці педагагічных работнікаў за вынікі сваёй працы; забяспечыць метадычнае суправаджэнне работы з маладымі і зноў прынятымі спецыялістамі, актывізаваць эфектыўныя формы работы па ўзаемадзеянню сям’і і школы.

Задачы вырашаліся праз працу педагагічнага савета, метадычныя і творчыя аб’яднанні педагогаў, самакантроль, вучнёўскае самакіраванне.

Пастаўленныя перад калектывам задачы былі ў асноўным выкананы, а ўзровень іх выканання прывёў да павышэння якасці працы педагагічнага калектыву:

1.забяспечана павышэнне прафесійнага ўзроўню педагагічных работнікаў праз іх бесперапынную адукацыю (курсы-семінары);

2.метадычныя аб’яднанні, атэстацыйная камісія ўстановы мэтанакіравана працавалі па стварэнні станоўчай матывацыі педагагічных кадраў на павышэнне кваліфікацыйнай катэгорыі;

3. назіраецца станоўчая дынаміка ў павышэнні вучэбныхз дасягненняў навучэнцаў;

4. вынікі выпускных экзаменаў падцвярджаюць вынікі навучальнага года;

5. праводзілася работа, накіраваная на ідэйнае і грамадзянска-патрыятычнае станаўленне асобы навучэнцаў праз уключэнне ў сацыяльна-значную і праектную дзейнасць;

6. ва ўстанове пастаянна праводзілася праца па стварэнні бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу.

У 2023/2024 навучальным годзе ва ўстанове адукацыі навучаліся 84 вучні (9 класаў камплектаў) і 24 выхаванцы (2 рознаўзроставыя групы). Сярэдняя напаўняльнасць класаў павялічылася ў параўнанні з мінулым годам і складае 9-10

чалавек. Вучэбныя заняткі былі арганізаваны ў адну змену, адукацыйны працэс – у рэжыме шасцідзённага тыдня, які ўключае пяцідзённы вучэбны тыдзень і адзін дзень для правядзення з навучэнцамі спартыўна-масавых, фізкультурна-аздараўленчых і іншых выхаваўчых мерапрыемстваў.

У 2024/2025 навучальным годзе неабходна працягнуць узаемадзеянне суб'ектаў адукацыйнага працэсу з сельскай бібліятэкай (экскурсіі і выхаваўчыя мерапрыемствы на базе сельскай бібліятэкі).

Адзіная інфармацыйная прастора ўстановы адкацыі складаецца з афіцыйнага сайта, а таксамі суполак і старонак у сацыяльных сетках Telegram-канале.

Забяспечаннасць установы спартыўным інвентаром і абсталяванне складае 83%. Ёсць неабходнасць працаваць над паляпшэннем матэрыяльна-тэхнічнай базы за кошт пазабюджэтных сродкаў і спонсарскай дапамогі.

Адукацыйны працэс ва ўстанове ажыццяўляўся ў адпаведнасці з нарматыўнымі і прававымі дакументамі, рэкамендаванымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Усе кабінеты ўстановы адпавядаюць санітарна-гігіенічным патрабаванням, аднак неабходна працягнуць работу па дааснашчэнні кабінетаў сродкамі навучання, а таксама сродкамі інфармацыйных тэхналогій, абсталяванню тэхнічнай майстэрні і кабінета абслугоўваючай працы.

На I і II ступенях агульнай сярэдняй адукацыі былі арганізаваны факультатыўныя заняткі, якія адрозніваліся мэтавай скіраванасцю, зместам, формай правядзення, пераемнасцю з асноўнымі курсамі. Факультатыўныя заняткі былі размеркаваны на аснове індывідуальных запытаў навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў. Усяго ў 2023/2024 навучальным годзе для арганізацыі факультатыўных заняткаў выдзелена 23 гадзіны.

Вучэбны план установы адукацыі выкананы ў поўным аб'ёме. Вынікам працы педагагічнага калектыву з'явілася 100% засваенне навучэнцамі адукацыйнага мінімуму ведаў, уменняў і навыкаў.

З 64 атэстуемых навучэнцаў на "9-10" завяршылі навучанне 6 (9,4%) навучэнцаў, што ў параўнанні з 2022/2023 навучальным годам вышэй на 4,2 %. На "5-10" навучальны год скончылі 39 навучэнцаў, што склала 61%, або на 3,6 % вышэй, чым у 2022/2023 навучальным годзе. На "3-10" навучальны год скончылі 25 навучэнцаў, што склала 39%. Сярэдні бал паспяховасці за 2023/2024 навучальны год склаў 7,1 (2022/2023 – 6,4). У 2024/2025 навучальным годзе педагагічным работнікам неабходна асаблівую ўвагу надаваць якасці адукацыі.

Выніковая атэстацыя па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі была праведзена ў перыяд з 1 чэрвеня па 7 чэрвеня 2024 года ў адпаведнасці з Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджанных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 11.07.2022 № 184 і іншымі нарматыўна прававымі актамі, якія рэгуліруюць арганізацыю адукацыйнага працэса ва

ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

У 2023/2024 навучальным годзе ва ўстанове адукацыі навучалася 6 выпускнікоў. Аналіз вынікаў выпускных экзаменаў паказвае, што навучэнцы прадэманстравалі валоданне вучэбным матэрыялам, практычнымі навыкамі на дастатковым, сярэднім і здавальняючым узроўні. Амаль ўсе навучэнцы змаглі падцвердзіць свае гадавыя адзнакі, назіраецца станоўчая дынаміка вынікаў вучэбнай дзейнасці па выніках выпускных экзаменаў. Можна зрабіць выснову аб тым, што педагагічным калектывам праводзілася сістэмная работа з навучэнцамі па падрыхтоўцы да выпускных экзаменаў, у тым ліку праз факультатыўныя заняткі, падтрымліваючыя і стымулюючыя заняткі.

Пры арганізацыі правядзення выніковай атэстацыі ва ўстанове адукацыі ў 2024/2025 навучальным годзе педагагічным работнікам установы адукацыі неабходна звярнуць увагу на веданне агульнадыдактычных прынцапаў дзесяцібальнай сістэмы ацэнкі ведаў навучэнцаў, змест нарматыўных актаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэгулюючых адукацыйны працэс ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, правядзенне прынцыповага аналізу аб'ектыўнасці выстаўлення адзнак, якасці вядзення дакументацыі спецыялістамі ўстановы адукацыі па выніках кожнай чвэрці з прымяненнем у дачыненні да педагагічных работнікаў мер матэрыяльнага стымулявання, або прыцягнення да дысцыплінарнай адказнасці.

Кіраўніцтву ўстановы адукацыі неабходна працягнуць мэтанакіраваную работу з вучнямі II ступені і іх законнымі прадстаўнікамі па выбару далейшай траекторыі навучання, устанаўлення сувязей з кадравымі службамі ўпраўленняў раённага выканаўчага камітэту, прадпрыемстваў і ўстаноў раёна з мэтай атрымання будучымі выпускнікамі накіраванняў на мэтавую падрыхтоўку спецыялістаў.

Класным кіраўнікам установы адукацыі неабходна:

1. уключыць сучасныя формы правядзення прафарыетацыі;

2. у рамках “Бацькоўскага ўніверсітэта”, на пастаяннай аснове праводзіць мэтанакіраваную работу па папулярызацыі ўстаноў вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай прафесійнай адукацыі Мінска і Мінскай вобласці.

Дзейнасць педагагічнага калектыву, накіраваная на ўдасканаленне адукацыйнага працэсу, арганізоўвалася праз працу вучэбна-метадычных аб'яднанняў, узаеманаведванне вучэбных заняткаў педагогамі, сумесную працу настаўнікаў па фарміраванні ўменняў і навыкаў навучэнцаў, самаадукацыю членаў педагагічнага калектыву, правядзенне іншых мерапрыемстваў.

Ва ўстанове адукацыі ўдзяляецца ўвага рабоце з інтэлектуальна адоранымі і здольнымі вучнямі. Падрыхтоўка алімпіяд ажыццяўляецца па індывідуальных планах падчас стымулюючых заняткаў, праз удзел у дыстанцыйных алімпіядах і конкурсах. У 2023/2024 навучальным годзе каманда ўстановы прымала ўдзел у II этапе рэспубліканскай алімпіяды па

вучэбных прадметах. Але трэба ўказаць на нізкі ўзровень выніковасці ўдзелу.

Навучэнцы ўстановы адукацыі прымалі ўдзел ў інтэлектуальных і творчых конкурсах, якія праводзіліся на працягу 2023/2024 навучальнага года. У рэспубліканскіх інтэлектуальных прадметных конкурсах ("Буслік", «Журавлик», «Кенгуру», "Синица" і інш.). Навучэнцы прымалі актыўны ўдзел у раённых творчых прадметных конкурсах, так, напрыклад, атрыманы дыплом 2 ступені ў раённым конкурсе чытальнікаў "Дзівосны свет літаратуры", дыплом 2 ступені ў раённым экалагічным конкурсе "Знатакі прыроды", дыплом 2 ступені ў конкурсе "Я - даследчык" у намінацыі "Філалогія", дыплом 1 ступені ў раённым конкурсе "Я і мама масцярыцы", дыплом 2 ступені ў раённым конкурсе "Я і тата майстры" і інш. У параўнанні з мінулым годам удзел у конкурсах вучняў і настаўнікаў перавышае паказчык 2022/2023 навучальнага года (на 3,7%).

З мэтай павышэння выніковасці ўдзелу ў алімпіядах і навукова-практычных канферэнцыях кіраўніцтву ўстановы адукацыі неабходна наладзіць ўзаемадзеянне з іншымі ўстановамі адукацыі пры арганізацыі працы з высокаматываванымі навучэнцамі (у тым ліку ў дыстанцыйнай форме) праз ўдзел у вэбінарах, практыкумах і наведванне навучальных курсаў па падрыхтоўцы да рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах.

Развіццё сістэмы выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ва ўстанове ажыццяўлялася ў адпаведнасці з асноўнымі палажэннямі ідэалогіі беларускай дзяржавы, прынцыпамі дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі, дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

Галоўная роля ў кіраванні працэсам развіцця асобы адводзіцца класнаму кіраўніку. Выхаваўчы працэс у 2023/2024 навучальным годзе забяспечвалі 9 класных кіраўнікоў, з іх з вышэйшай адукацыяй - 8 чалавек (88,8 %), з вышэйшай катэгорыяй – 1 (11,1%), з першай катэгорыяй – 7 (77,7%), з другой катэгорыяй – 1(11,1%).

У дашкольных рознаўзроставых групах яслей-сада адукацыйны працэс ажыццяўлялі выхавальнікі Забалоцкая С.П., Мініч Н.Н., Пешко Т.І.

Выхавацелі дашкольнай адукацыі працавалі над развіццём пазнавальных здольнасцей дзяцей з улікам іх індывідуальных асаблівасцей і інтарэсаў. Задача вырашалася ў сумеснай дзейнасці дарослых і выхаванцаў, самастойнай дзейнасці дзяцей, у рамках непасрэднай адукацыйнай дзейнасці і пры правядзенні рэжымных момантаў.

Для паспяховай арганізацыі пазнавальнага развіцця створана прадметна развіваючае асяроддзе. Выхаванцы маюць свабодны доступ да ўсіх вуглакоў развіцця, якія знаходзяцца ў групах: кніжны вугалок, вугалок тэатральнай дзейнасці, вугалок выяўленчай творчасці, вугалок сюжэтна-ролевых гульняў, вугалок прыроды і вугалок дзіцячага эксперыментавання. Усе цацкі, дыдактычныя, настольна друкаваныя гульні, а таксама будаўнічы матэрыял знаходзяцца ў свабодным доступе. Навучальны працэс быў арганізаваны праз праблемна-пошукавы метад, гэты метад часцей за ўсё

выкарыстоўваецца падчас заняткаў у рознаўзроставай группе №2.

Развіццю пазнавальных здольнасцей спрыяў удзел у конкурсах, даследчых работах. Так працягваецца рэалізацыя педагагічнага праекта “Маленькі патрыёт”. Аднак, між тым, неабходна актывізаваць дзейнасць выхавальнікаў па стварэнні наглядна-дыдактычных матэрыялаў і аснашчэнні групавых памяшканняў сучаснымі сродкамі навучання.

У дашкольных групах створаны ўмовы для агульнаўмацавальных мерапрыемстваў: выкарыстоўваецца «С»-вітамінізацыя ежы, з выхаванцамі праводзяцца загартоўваючыя працэдуры. Праводзіўся колькасны і якасны аналіз захворванняў за кожны месяц, квартал, паўгоддзе, год, сістэматычны кантроль за санітарна-гігіенічнымі ўмовамі ў дашкольнай групе.

Створаны ўмовы для фізкультурна-аздараўленчай работы. Нягледзячы на папаўненне матэрыяльна-тэхнічнай базы, часткова абсталяванне не ў поўнай меры адпавядае сучасным патрабаванням, інвентар зношваецца, патрабуе перыядычнай замены і папаўнення. Фізкультурна-аздараўленчую работу ажыццяўляе кіраўнік фізічнага выхавання.

Колькасныя паказчыкі захворванняў дашкольнікаў невысокія. Прапушчана па хваробе адным выхаванцам – 1,4 дзетадні. Асноўная прычына адсутнасці – прастудныя захворванні.

Адзначаецца тэндэнцыя да павелічэння забяспечанасці дашкольнай групы па ўсіх напрамках: 2023/2024 – 84%.

На працягу навучальнага года праводзілася актыўная работа па пераемнасці паміж дашкольнай групай і першай ступенню навучання: было арганізавана ўзаеманаведванне заняткаў выхавальнікамі і настаўнікамі пачатковых класаў, праводзіліся сумесныя мерапрыемствы.

Выхаваўчая і ідэалагічная праца ва ўстанове адукацыі праводзіцца ў адпаведнасці з дзеючымі нарматыўнымі прававымі дакументамі. Арганізавана работа метадычнага аб’яднання класных кіраўнікоў, кіраўнік – Залатар К.У., мэтай якога з’яўляецца павышэнне педагагічнага майстэрства класных кіраўнікоў, абагульненне і распаўсюджванне станоўчага педагагічнага вопыту выхаваўчай работы.

Важным паказчыкам сфарміраванасці грамадзянска-патрыятычных якасцей з'яўляюцца веданне і павага да дзяржаўнай сімволікі. Пры правядзенні ўрачыстых, грамадска значных мерапрыемстваў, спартыўных спаборніцтваў выкарыстоўваецца нацыянальная сімволіка і атрыбутыка. Вугалкі дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь створаны ва ўсіх навучальных кабінетах і дашкольных групах установы.

Планаванне мерапрыемстваў па ідэалагічным і грамадзянска-патрыятычным выхаванні арганізавана з улікам календара дзяржаўных свят, памятных дат і міжнародных святочных дзён, інтарэсаў і запытаў навучэнцаў.

Навучэнцы ўстановы з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі раённых і агульнашкольных мерапрыемстваў рэспубліканскіх акцый “Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь”.

Навучэнцы сістэматычна наведваюць кінатэарт “Эра”, Дзяржынскі краязнаўчы музей, эколага-біялагічны цэнтр, прымаюць удзел у выязных экскурсіях (у рамках акцыі “Збяры Беларусь у сваім сэрцы”). Гэта спрыяе актыўнаму ўключэнню падрастаючага пакалення ў грамадскае жыццё, вывучэнню навучэнцамі культуры, традыцый, гісторыі роднага краю.

Удасканаленне сістэмы дзіцячага самакіравання і фарміраванне лідарскіх якасцей ажыццяўляецца на аснове дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі” і “Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя”. Ахоп вучнямі ГА “БРСМ”: 2023/2024 – 100%. Ахоп вучнямі ГА “БРПА”: 2023/2024 – 89%. У скарбонцы добрых спраў членаў ГА “БРПА”, “БРСМ” удзел у акцыях “Дом без адзіноты”, “Ветэран жыве побач”, “Наша піянерская праца табе Айчына”, акцыі “Абеліск”. Вучні прымаюць актыўны ўдзел у акцыі “Цуды на Каляды”, бяруць актыўны ўдзел у “Месячніку па навядзенні парадку на зямлі” (добраўпарадкоўваюць і прыводзяць у парадак тэрыторыю ўстановы, помнікаў загінуўшым воінам у час Вялікай Айчыннай вайны), праводзяць рэйды-праверкі санітарнага стану кабінетаў, захаванасці падручнікаў, эканоміі электраэнергіі.

Прыярытэтным напрамкам у рабоце ўстановы з’яўляецца супрацоўніцтва з сям’ёй. Праца будуецца па трох напрамках: арганізацыйная, інфармацыйна-асветніцкая, псіхолага-педагагічная дзейнасць, зыходзячы з сацыяльна-педагагічнай характарыстыкі ўстановы, сацыяльнага статусу законных прадстаўнікоў навучэнцаў.

Формы работы з сям’ёй разнастайныя. Вялікая ўвага надаецца псіхолага-педагагічнай асвеце праз арганізацыю кансультацый, правядзенне індывідуальных сустрэч, правядзенне сумесных мерапрыемстваў, правядзенне бацькоўскіх сходаў. Класнымі кіраўнікамі, педагогам-псіхолагам наведваюцца сем’і навучэнцаў з мэтай вывучэння ўмоў пражывання непаўналетніх і ўстанаўлення пазітыўных узаемаадносін з навучэнцамі і іх законнымі прадстаўнікамі.

Прастора ўстановы ўключае 8 аб'яднанняў па інтарэсах, адкрытых за кошт гадзін агранізацыйна-выхаваўчай работы, 1 аб’яднанне па інтарэсах ад ЭБЦ Дзяржынскага раёна, 1 – ад ДРЦТіК Дзяржынскага раёна, 3 – ад ЦДТ Дзяржынскага раёна. Ахоп дадатковай адукацыяй на базе ўстановы адукацыі складае 100.

Ва ўстанове адукацыі таксама створаны ўмовы для развіцця спорту: спартыўная зала працуе з 9.00 да 18.30. Ва ўстанове праводзіцца мэтанакіраваная работа па фарміраванні асноў здаровага ладу жыцця, зберажэнні і ўмацаванні здароўя дзяцей.

Пазакласная фізкультурна-аздараўленчая і спартыўна-масавая работа па фізічным выхаванні ва ўстанове адукацыі прадстаўлена ўнутрышкольнай круглагадовай спартакіядай. Каманда ўстановы прымае ўдзел ва ўсіх асноўных спартыўных мерапрыемствах: спаборніцтвы сярод дзяцей і падлеткаў па біятлоне, лыжным спорце і стральбе з пнеўматычнай зброі “Снежны снайпер” на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, “Алімпійскія надзеі Беларусі” па летнім і зімовым

шматбор’і “Здароўе” Дзяржаўнага фізкультурна-аздараўленчага комплексу Рэспублікі Беларусь сярод навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Шосты школьны дзень з’яўляецца арганічнай часткай цэласнай сістэмы адукацыйнага працэсу. Найважнейшая задача педагагічнага калектыву – эфектыўная арганізацыя выхаваўчай работы ў шосты школьны дзень тыдня. Улічваючы традыцыі ўстановы, узровень выхаванасці навучэнцаў, інтарэсы і ўзроставыя асаблівасці дзяцей у суботнія дні праводзяцца мерапрыемствы па наступных напрамках:

фарміраванне здаровага ладу жыцця: правядзенне гутарак, лекцый па фарміраванні навыкаў здаровага ладу жыцця; уцягванне ў спартыўна-масавую працу; наведванне спартыўных мерапрыемстваў; удзел у раённых, агульнашкольных спаборніцтвах, фізкультурна-аздараўленчых святах; наведванне заняткаў па плаванні;

працоўнае: далучэнне навучэнцаў да грамадска-карыснай працы (“Чысты двор”, “Школьны двор маёй мары”);

прафарыентацыйная дзейнасць: сустрэчы з выпускнікамі ўстановы, прадстаўнікамі навучальных устаноў, людзьмі розных прафесій, наведванне прадпрыемстваў мікраараёна;

грамадзянска-патрыятычнае і інтэлектуальна-эстэтычнае: правядзенне розных выхаваўчых мерапрыемстваў.

Працэнт наведвання мерапрыемстваў у суботу дастаткова высокі. За мінулы навучальны год ахоп навучэнцаў склаў 79%. У шосты дзень тыдня арганізавана кансультацыйная работа педагога -псіхолага з вучнямі і законнымі прадстаўнікамі.

Выхаваўча-прафілактычная работа ва ўстанове ажыццяўляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі Закона Рэспублікі Беларусь “Аб асновах сістэмы прафілактыкі безнагляднасці і злачынстваў непаўналетніх”. Ва ўстанове працуе савет па прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх, складзены і рэалізуецца план работы на каляндарны год. На пасяджэпнях (не радзей 1 раза на месяц) разглядаюцца пытанні аб стане выхаваўча-прафілактычнай работы і работы па прафілактыцы сацыяльнага сіроцтва, арганізацыі занятасці навучэнцаў, матэрыялы аб правапарушэннях непаўналетніх, прымаюцца канкрэтныя рашэнні. Маюцца пратаколы пасяджэнняў, загады аб выкананні рашэнняў Савета. На асаблівым кантролі знаходзіцца наведванне навучэнцамі навучальных заняткаў. Ва ўстанове выкарыстоўваецца электронная база “Улік пропускаў”, ажыццяўляецца штодзённы кантроль пропускаў вучэбных заняткаў намеснікам дырэктара па асноўнай дзейнасці. Інфармацыя па выніках заслухоўваецца на нарадах пры дырэктару.

У рамках работы па рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта РБ № 18 “Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у неблаганадзейных сем’ях” педагагічны калектыў установы праводзіць працу па выяўленні ранняга сямейнага недабрабыту. Праводзіцца вывучэнне і комплексная ацэнка становішча дзяцей у кожнай сям’і.

Выснова:

1. створаны ўмовы для развіцця ініцыятывы кожнага навучэнца, фарміравання і праяўлення лідарскіх якасцей;

2. фізкультурна-аздараўленчая і спартыўна-масавая работа ва ўстанове з'яўляецца часткай адукацыйнага працэсу і накіравана на захаванне і ўмацаванне здароўя навучэнцаў, фарміраванне ў іх навыкаў здаровага ладу жыцця;

3. ва ўстанове вядзецца планамерная работа па сацыяльна-педагагічнаму і псіхалагічнаму суправаджэнню працэсу праз цеснае супрацоўніцтва з усімі зацікаўленымі асобамі і службамі.

Разам з тым:

1. патрабуецца мэтанакіраваная работа па прыцягненні большай колькасці падлеткаў да ўдзелу ў моладзевых арганізацыях БРСМ і БРПА, развіцця моладзевых ініцыятыў;

2. недастатковы ўзровень ўдзелу навучэнцаў у мерапрыемствах даследчага характару;

3. неабходна працаваць з законнымі прадстаўнікамі ў рамках "Бацькоўскага ўніверсітэта" па павышэнні псіхолага-педагагічнай асветы;

4. неабходна стварыць ўмовы поспеху для выхаванцаў у пазнавальна-маўленчай дзейнасці;

5. пашырыць кола ўдзельнікаў мерапрыемстваў грамадзянска-патрыятычнага накірунку.

Асноўныя напрамкі работы ў 2024/2025 навучальным годзе.

1. павышэнне ўзроўню матывацыі ўступлення ў пярвічную арганізацыю БРПА і БРСМ праз разнастайнасць форм і метадаў грамадска-карыснай дзейнасці дзіцячых і маладзёжных аб'яднанняў;

2. актывізацыя дзейнасці па выкарыстанні ў выхаваўчай рабоце навукова-педагагічных дасягненняў, інавацыйных форм і метадаў, павышэнні ролі інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій;

3. прымяненне сучасных, інтэрактыўных форм і метадаў арганізацыі работы законнымі прадстаўнікамі;

4. развіццё пазнавальнай актыўнасці выхаванцаў, шляхам арганізацыі пазнавальна-творчай дзейнасці, удзелу ў творчых і інтэлектуальных конкурсах.

У 2023/2024 навучальным годзе адукацыйны працэс ва ўстанове ажыццяўлялі 20 педагагічных работнікаў. 95 % педагогаў маюць вышэйшую адукацыю, 75 % – першую і вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю.

За перыяд 2023/2024 навучальнага года план павышэння кваліфікацыі педагагічнымі работнікамі выкананы на 100 %. Прайшлі павышэнне кваліфікацыі 2 педагогі, 4 педагогі павысілі кваліфікацыйную катэгорыю.
Сярэдні ўзрост педагогаў установы – 43,7 гады. Педагагічны калектыў адзначаецца высокай стабільнасцю: 59% працуюць ва ўстанове больш за 5 гадоў.

Кіраўніцтву ўстановы неабходна прадоўжыць мэтанакіраваную работу па прыцягненні маладых спецыялістаў ва ўстанову адукацыі, у тым ліку праз заключэнне мэтавых дагавароў.

Высновы: аналіз кадравага складу педагогаў сведчыць аб наяўнасці ў педагогаў вопыту для якаснага ажыццяўлення

адукацыйнага працэсу па ўсіх вучэбных прадметах. Ва ўстанове адукацыі створаны ўмовы для забеспячэння бесперапыннай прафесійнай адукацыі педагогаў, павышэння іх кваліфікацыйнага узроўня.

Прыярытэтнымі задачамі метадычнай службы установы адукацыі з'яўляецца забеспячэнне якаснага засваення педагогамі сучаснай нарматыўнай прававой і навучальна-метадычнай базы выкладання прадметаў; павышэнне адукацыйнага і кваліфікацыйнага ўзроўняў педагагічных работнікаў.

Нягледзячы на ажыццяўленне планавай работы метадычнай службы ўстановы адукацыі на працягу апошніх гадоў зніжана колькасць публікацый перадавога вопыту настаўнікаў у сродках масавай інфармацыі. Вывучэнне зместу і эфектыўнасці метадычнай работы дазваляе зрабіць вывад аб спланаванай і арганізаванай метадычнай вучобе педагогаў. Пытанні арганізацыі метадычнай работы падкантрольныя адміністрацыі. Пытанні, што разглядаюцца на пасяджэннях вучэбна-метадычных фарміраванняў, адпавядаюць патрабаванням дзяржаўных нарматыўных дакументаў да арганізацыі адукацыйнага працэсу, прафесійным запатрабаванням педагагічных работнікаў. Сведчаннем арганізацыі мэтанакіраванай метадычнай работы на творчым узроўні з'яўляецца ўдзел педагагічных работнікаў у рэалізацыі праектнай дзейнасці.

Разам з тым застаецца недастаткова эфектыўным упраўленчае і арганізацыйна-метадычнае суправаджэнне працэсу атэстацыі: паказчык кваліфікацыйнага ўзроўню сведчыць аб магчымасці яго павышэння значнай часткай педагогаў на вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю.

Высновa:

выкарыстоўваемыя ва ўстанове формы метадычнай работы ўзаемазвязаны і забяспечваюць стварэнне асяроддзя для павышэння прафесійнай і творчай актыўнасці педагогаў, мэты і задачы метадычнай дзейнасці арыентаваны на развіццё прафесійных кампетэнцый удзельнікаў адукацыйнага працэсу.

Недастаткова актыўна праводзіцца работа па паляпшэнні вучэбна-метадычнага забеспячэння вучэбных кабінетаў, па ўключэнні педагогаў у прафесійныя конкурсы, нязначны працэнт педагогаў маюць публікацыі ў газетах і метадычных часопісах.

Асноўныя напрамкі работы ў 2024/2025 навучальным годзе:

1. удасканальванне шляхоў павышэння педагагічнага майстэрства педагогаў і формы педагагічнага сервісу, павышэнне кваліфікацыйнага ўзроўню педагогаў праз арганізацыю работы пастаянна дзеючых семінараў, удзел у сеткавых аб'яднаннях настаўнікаў, творчых групах;

2. стварэнне ўмоў для развіцця прафесійнага майстэрства настаўнікаў у рабоце з інтэлектуальна адоранымі і развітымі вучнямі, трансляцыі вопыту ў перыядычных выданнях праз удасканальванне сістэмы маральнага і матэрыяльнага стымулявання работнікаў па выніках працы.

У 2023/2024 навучальным годзе ва ўстанове адукацыі не зафіксаваны выпадакі траўматызма навучэнца. Ва ўстанове праводзіліся на працягу года трэніроўкі па эвакуацыі навучэнцаў і работнікаў у выпадку ўзнікнення надзвычайных сітуацый. Афармленыя вугалкі “Пажарная бяспека”,”Бяспечны шлях у школу”.

Харчаванне ва ўстанове арганізавана ў адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі дакументамі. Бясплатнае харчаванне ў межах выдзеленых бюджэтных сродкаў атрымлівалі ўсе навучэнцы. Двухразовае бясплатнае харчаванне ў межах выдзеленых бюджэтных сродкаў атрымлівалі навучэнцы: са шматдзетных, чый статус пацверджаны адпаведнымі дакументамі. Ва ўстанове ўстаноўлена электронная праграма “Здаровае харчаванне”.

Шмат увагі ў 2023/2024 навучальным годзе надавалася стварэнню ўмоў, неабходных для навучання і выхавання навучэнцаў. Сіламі калектыву ўстановы, пры падтрымцы шэфскіх арганізацый, спонсараправодзілася работа па развіцці матэрыяльна-тэхнічнай і вучэбна-метадычнай базы вучэбных кабінетаў. На развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы адукацыі прыцягваліся сродкі спонсараў і шэфскіх арганізацый. Дзякуючы гэтай дапамозе набыты матэрыяльныя каштоўнасці на суму 4647 беларускіх рублёў 13 капеек.

У 2024/2025 навучальным годзе неабходна:

1. актывізаваць работу па прыцягненні сродкаў у выглядзе спонсарскай дапамогі юрыдычных асоб і дабраахвотных ахвяраванняў фізічных асоб у памерах, дастатковых для забеспячэння патрэб установы адукацыі ў будаўнічых і расходных матэрыялах, пабыцці новых адзінак камп’ютарнай тэхнікі;

2. павялічыць колькасць здаваемай установай адукацыі другаснай сыравіны.

## II. Мэты і задачы дзейнасці ўстановы адукацыі на 2024/2025 навучальны год

Мэта:

забеспячэнне якасці адукацыі, накіраванай на фарміраванне канкурэнтаздольнай асобы праз стварэнне практыка-арыентаванага адукацыйнага асяроддзя, якое базуецца на сучасных рэсурсах і прадуктыўных тэхналогіях.

Задачы:

фарміраваць прафесійны стыль творчай дзейнасці педагогаў праз метадычнае і псіхалагічнае суправаджэнне росту прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў і іх паспяховую атэстацыю;

прапагандаванне перадавога вопыту педагогаў па ўкараненні сучасных педагагічных тэхналогій, эфектыўных спосабаў прыёмаў навучання;

забяспечыць гарантыі даступнасці, поўнага задавальнення запытаў на адукацыйныя паслугі і магчымасці атрымання якаснай адукацыі праз стварэнне ўмоў для фарміравання даследчых уменняў навучэнцаў, для развіцця творчай асобы, яе самавызначэнне і самарэалізацыя;

псіхолага-педагагічнае суправаджэнне ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

фарміраваць і развіваць крытычнае і візуальнае мысленне ў вучняў, вобразнае ўяўленне ведаў і навучальных дзеянняў;

павышаць якасць выхаваўчага працэсу праз павышэнне эфектыўнасці патрыятычнага выхавання навучэнцаў;

удасканаленне прафарыентацыйнай работы з вучнямі, падрыхтоўка іх да самастойнага жыцця;

авалоданне ведамі і навыкамі здаровага ладу жыцця, бяспекі жыццядзейнасці і асноў прававых ведаў;

удасканаленне работы органаў вучнёўскага самакіравання, дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб’яднанняў;

арганізаваць вольны час непаўналетніх шляхам іх прыцягнення да актыўных, здароўезберагаючых форм занятасці з мэтай недапушчэння асацыяльных паводзін;

фарміраваць інфармацыйную культуру ўсіхудзельнікаў адукацыйнага працэсу, прадоўжыць навучанне дзяцей і падлеткаў бяспечным паводзінам і ўменню супрацьстаяць негатыўным з’явам віртуальнасці;

стварыць роўныя ўмовы для атрымання якаснай адукацыі, забяспечыўшы бяспечныя ўмовы пры арганізацыі адукацыйнага працэсу і пераемнасць на ўсіх этапах навучання ва ўстанове;

развіццё маўлення дашкольнікаў у працэсе сюжэтна-ролевай гульні.

Метадычная тэма работы ўстановы адукацыі на 2024/2025 навучальны год: “Удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці настаўнікаў па выкарыстанні тэхналогіі візуалізацыі навучальнай інфармацыі ў сучасным адукацыйным працэсе”.

# III. Планаванне дзейнасці ўстановы адукацыі на 2024/2025 навучальны год
## Раздзел 2. Працэс упраўлення ўстановай адукацыі
### 2.1. Планаванне, арганізацыя дзейнасці ўстановы адуканыі

| Месяц | Пасяджэнні педагагічнага савета | | Нарады пры дырэктары | |
|---|---|---|---|---|
| | **Назва мерапрыемства** | **Адказны** | **Назва мерапрыемства** | **Адказны** |
| ВЕРАСЕНЬ | **“Аналіз і планаванне дзейнасці ўстановы. Актуальныя накірункі трансфармацыі адукацыйнай прасторы: перспектывы і новыя магчымасці развіцця традыцыйнай адукацыі”**<br>Аб выбарах сакратара педагагічнага савета<br><br>Аб стане і перспектывах адукацыйнага працэсу ў 2024/2025 н.г.<br><br>Абмеркаванне і зацверджанне гадавога плана<br><br>Аб размеркаванні гадзін вучэбнага плана, якія адведзены для правядзення факультатыўных, стымулюючых і падтрымліваючых заняткаў.<br><br>Аб рабоце груп падоўжанага дня на 2024/2025 навучальны год<br><br>Аб разглядзе кандыдатур для ўключэння ў склад сцягавай групы<br>Аб зацвярджэнні метадычнай сеткі ўстановы<br>Аб жыццеўладкаванні выпускнікоў<br>Аб зацвярджэнні праграм дадатковай адукацыі і аб'яднанняў па інтарэсах<br>Аб педагагічнай нагрузцы настаўнікаў на 2024/2025 навучальны год | Дырэктар<br><br>Дырэктар<br><br>Дырэктар<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br>Намеснік дырэктара<br>Намеснік дырэктара<br>Намеснік дырэктара<br>Дырэктар | Аб арганізацыі ўліку дзяцей, якія падлягаюць навучанню на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі.<br><br>Забеспячэнне навучальнай і метадычнай літаратурай навучэнцаў і настаўнікаў.<br><br>Аб мерах па прафілактыцы бяспекі жыццядзейнасці выхаванцаў дашкольнай адукацыі і навучэнцаў па папярэджанні дзіцячага траўматызму. | Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| К<br>А<br>С<br>Т<br>Р<br>Ы<br>Ч<br>Н<br>І<br>К | | | Прамежкавыя вынікі адаптацыі навучэннаў I і V класаў: праблемы і шляхі іх вырашэння.<br><br>Работа настаўнікаў са здольнымі кучиямі, падрыхтоўка да алімпіяд па вучэбных прадметах.<br><br>Аб прамежкавых выніках рэалізацыі педагагічнага праекта “Маленькі патрыёт” | Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара |
| Л<br>І<br>С<br>Т<br>А<br>П<br>А<br>Д | **“Фарміраванне маральных ідэалаў і духоўна-каштоўнасных арыенціраў у працэсе гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа”**<br><br>Аб адаптацыі выхаванцаў і навучэнцаў 1, 5 класаў асаблівасцей навучання на новай ступені.<br><br>Аб маніторынгу здароўя навучэнцаў установы адукацыі.<br><br>Аб маніторынгу якасці навучанасці па выніках 1 чвэрці 2024/2025 навучальнага года | Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара | Аб выніках удзелу ў II этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах.<br><br>Стан работы па ахопе вучняў гарачым харчаваннем, работа класных кіраўнікоў па арганізацыі забеспячэння навучэнцаў гарачым харчаваннем.<br><br>Праца ўстановы адукацыі па выкананні Дэкрэта №18 Рэспублікі Беларусь.<br><br>Аб арганізацыі работы ў 6 школьны дзень | Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара |
| С<br>Н<br>Е<br>Ж<br>А<br>Н<br>Ь | | | Аб арганізацыі работы ўстановы адукацыі па супрацьдзеянні карупцыі.<br><br>Аналіз наведвальнасці вучэбных заняткаў вучнямі па выніках II чвэрці.<br><br>Аб плане работы з вучнямі ў час зімовых канікул. Арганізацыя работы аздараўленчага лагера.<br><br>Аб зацвярджэнні графікаў водпускаў | Дырэктар<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Дырэктар |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Аб стане выкладання вучэбнага прадмета “Працоўнае навучанне” на I і II ступенях агульнай сярэдняй адукацыі | Намеснік дырэктара |
| **СТУДЗЕНЬ** | **“Дыферыенцыяцыя і індывідуалізацыя адукацыйнага працэсу”**<br>Разгляд плана работы на вучэбна-доследным участку на 2025 год.<br><br>Аб прафілактыцы дзіцячага траўматызму ў адукацыйным працэсе. | Вялічка Ір.І.<br><br>Намеснік дырэктара | Аб выкананні педагогамі ўстаноўленых патрабаванняў па вядзенні школьнай дакументацыі (вядзенне класных журналаў і журналаў аб’яднанняў па інтарэсах, журнала ГПД), планаў па выхаваўчай работы на канец першага паўгоддзя | Намеснік дырэктара |
| **ЛЮТЫ** | | | Эфектыўнасць работы з высокаматываванымі вучнямі, забеспячэнне рэалізацыі патэнцыйных здольнасцей<br><br>Аб якасці правядзення гадзін інфармавання і класных гадзін ва ўстанове адукацыі.<br><br>Якасць правядзення падтрымліваючых і стымулюючых заняткаў<br><br>Аб рабоце Савета прафілактыкі<br>Аб арганізацыі прафарыентацыйнай работы з навучэнцамі ва ўстанове адукацыі | Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Педагог-псіхолаг<br>Намеснік дырэктара |
| **САКАВІК** | **“Выхаванне асобы школьніка – важнейшыя ўмовы аптымізацыі вучэбнага працэссу”** | | Сістэма работы ўстановы адукацыі па прафілактыцы распаўсюджвання і спажывання наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў і іх аналагаў.<br><br>Аб аказанні сацыяльна-педагагічнай падтрымкі і псіхалагічнай дапамогі ўдзельнікам адукацыйнага працэсу. | Намеснік дырэктара<br><br>Педагог-псіхолаг |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Аб маніторынгу якасці навучанасці навучэнцаў па выніках 3 чвэрці 2024/2025 навучальнага года<br><br>Аб стане выкладання вучэбных прадметаў “Асновы бяспекі жыццядзейнасці” ў 5 класе і на 1 ступені агульнай сярэдняй адукацыі | Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара |
| **К А С Т Р Ы Ч Н І К** | | | Аб выніках вывучэння патрэбы ў рабоце яслей-сада ў летні перыяд у законных прадстаўнікоў выхаванцаў дашкольных груп<br><br>Аб выніках вывучэння работы аб’яднанняў па інтарэсах, факультатыўных заняткаў выхаваўчай накіраванасці<br>Аб рабоце бракеражнай камісіі і Савета па харчаванню<br><br>Аб эфектыўнасці работы школы ў рамках праекта “Бацькоўскі ўніверсітэт” | Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара |
| **М А Й** | **“Аб допуску да выпускных экзаменаў па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі”**<br><br>**“Аб пераводзе навучэнцаў I-VIII класаў у наступны клас”**<br><br>Аб арганізацыі работы ўстановы ў час летніх канікул | Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара | Аб нарматыўных прававых і лакальных актах, якія рэгулююць пытанні завяршэння 2024/2025 навучальнага года, арганізацыі выпускных экзаменаў па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі<br><br>Аб арганізацыі працоўнай практыкі навучэнцаў V-VIII класаў<br>Аб правядзенні арганізацыйна-педагагічных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да прыёму дзяцей у I клас | Намеснік дырэктара<br><br>Вялічка Ір.І.<br><br>Намеснік дырэктара |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Аналіз работы настаўнікаў-прадметнікаў па арганізацыі паўтарэння вучэбнага матэрыялу ў выпускным класе па вучэбных прадметах<br><br>Аб планаванні летняй занятасці навучэнцаў і выхаванцаў яслей-сада<br><br>Аб стане выкладання вучэбнага прадмета “Фізіка” на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі | Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара |
| **Ч Э Р В Е Н Ь** | **“Аб выдачы пасведчанняў аб агульнай базавай адукацыі і адлічэнні ў сувязі з атрыманнем агульнай базавай адукацыі”**<br><br>Аб правядзенні атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі | Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара | Аб вывучэнні запытаў навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў па арганізацыі факультатыўных заняткаў на 2025/2026 навучальны год<br><br>Аналіз выканання вучэбных праграм<br><br>Аналіз і рэзультатыўнасць работы вучэбна-метадычных аб’яднанняў | Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара<br><br>Намеснік дырэктара Кіраўнікі ВМА |
| **Ж Н І В Е Н Ь** | **“Асноўныя аспекты аналізу працы за 2024/2025 навучальны год. Задачы педагагічнага калектыву ўстановы адукацыі ў 2025/2026 навучальным годзе”**<br><br>Аб арганізацыі адукацыйнага працэсу ў 2025/2026 навучальным годзе. Зацвярджэнне педагагічнай нагрузкі настаўнікаў на новы навучальны год<br><br>Аб рабоце педкалектыва ў рамках рэалізацыі педагагічнага праекта “Маленькі патрыёт” (2022 - 2025)<br><br>Аб прафілактыцы супрацьпраўных і суіцыдальных паводзін сярод падлеткаў | Намеснік дырэктара<br><br>Дырэктар<br><br>Ціхановіч А.Ф. | Аб падрыхтоўцы ўстановы адуканыі да новага навучальнага года:<br>1. удакладненне спісачнага складу вучняў па класах.<br>2. арганізацыя работы па ахове жыцця і здароўя дзяцей.<br>3. санітарна-гігіенічны рэжым і правілы бяспекі.<br>4. арганізацыя работы дашкольных груп<br>5. арганізацыя гарачага харчавання навучэнцаў і выхаванцаў<br>6. забяспечанасць установы адукацыі падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі, вучэбнымі праграмамі, | Намеснік дырэктара<br>Намеснік дырэктара<br>Намеснік дырэктара<br>Намеснік дырэктара<br>Намеснік дырэктара<br>Намеснік дырэктара |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | вучэбна-метадычнымі комплексамі для правядзення факультатыўных заняткаў.<br><br>Вынікі праходжання навучэнцамі практыкі на прышкольным вучэбна-вопытным участку. | Вялічка Ір.І. |

## 2.2. Планаванне самакантролю

| Пытанні для кантролю | Мэта кантролю | Від кантролю | Метады кантролю | Адказныя асобы | Месца падвядзення вынікаў |
|---|---|---|---|---|---|
| ***Верасень***<br>*1. Кантроль за выкананнем арганізацыі і ўліку дзяцей, якія падлягаюць навучанню на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі* | | | | | |
| Улік дзяцей, якія падлягаюць навучанню на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі | Аналіз работы класных кіраўнікоў па ахопе навучаннем усіх навучэнцаў мікрараёна | Тэматычны | Аналіз справаздач класных кіраўнікоў | | Аператыўная нарада |
| *2. Кантроль за станам выкладання вучэбных прадметаў* | | | | | |
| Арганізацыя факультатыўных заняткаў | Праверыць працу педагогаў па камплектаванні факультатыўных заняткаў, запаўненні журналаў | Персанальны | Субяседаванне з педагогамі | Намеснік дырэктара | Інфармацыя намесніка дырэктара |
| *2. Кантроль за дакументацыяй* | | | | | |
| Класныя журналы | Якасць афармлення Класных журналаў. Наяўнасць звестак пра вучняў іх бацькоў. Занятасць навучэнцаў на факультатыўных занятках і занятках па інтарэсах.<br>Лісток здароўя | Тэматычны | Праверка журналаў | Намеснік дырэктара | Інфармацыя намесніка дырэктара |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Стан асабовых спраў навучэнцаў, выхаванцаў дашкольнай адукацыі | Праверыць працу класных кіраўнікоў па афармленні асабістых спраў і зноў прыбыўшых навучэнцаў | Персанальны | Праверка асабістых спраў | Намеснік дырэктара | Інфармацыя намесніка дырэктара |
| Арганізацыя планавання вучэбна-метадычнай дзейнасці педагогаў | Праанілізаваць своечасовасць і якасць каляндарна-тэматычнага планавання і праграм па факультатыўных занятках у педагогаў | Персанальны | Праверка планаў работ | Намеснік дырэктара | Субяседаванне |
| Праверка дзённікаў вучняў 3, 6 класаў | Захаванне адзіных патрабаванняў да вядзення дзённікаў | Тэматычны | Аналіз дзённікаў | Намеснік дырэктара | Інфармацыя намесніка дырэктара |
| *4. Кантроль за станам здароўя і здаровым ладам жыцця навучэнцаў* | | | | | |
| Арганізацыя харчавання навучэнцаў. Арганізацыя гарачага харчавання для дзяцей са шматдзетных сем'яў | Праверыць працу класных кіраўнікоў па арганізацыі харчавання навучэнцаў | Тэматычны | Субясeдванне з класнымі кіраўнікамі | Дырэктар | |
| Стварэнне бяспечных умоў жыццядзейнасці ў дашкольных групах | Захаванне адзіных патрабаванняў па стварэнні беяспечных умоў | Тэматычны | Наведванне заняткаў, аналіз | Намеснік дырэктара | Інфармацыя намесніка дырэктара |
| *5. Кантроль за станам выхаваўчай работы* | | | | | |
| Арганізацыя работы ва ўстанове па грамадзянска-прававым выхаванні навучэнцаў | Праца педагогоў па грамадзянска-прававым выхаванні навучэнцаў | Тэматычны | Наведванне заняткаў, аналіз | Інфармацыя намесніка дырэктара | Аператыўная нарада |
| ***Кастрычнік***<br>*1. Кантроль за выкананнем арганізацыі і ўліку дзяцей, якія падлягаюць навучанню на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі* | | | | | |
| Праца з высокаматываванымі дзецьмі | Аналіз работы настаўнікаў з вучнямі, якія маюць павышаную матывацыю да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, падрыхтоўка | Персанальны | Субяедванне, наведванне заняткаў | Намеснік дырэктара | Інфармацыя намесніка дырэктара |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | вучняў да рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах | | | | |
| *2. Кантроль за станам выкладання вучэбных прадметаў* | | | | | |
| Група падоўжанага дня | Вызначэнне ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі выхавальнікаў | Персанальны | Наведванне заняткаў | Намеснік дырэктара | Інфармацыя намесніка дырэктара |
| Выкананне патрабаванняў па пераемнасці ў 1, 5 класах | Метадычная пісьменнасць педагогаў, якія працуюць у 1, 5-х класах | Тэматычны | Назіранне, гутаркі | Намеснік дырэктара | ВМА педагогаў |
| *3. Кантроль за дакументацыяй* | | | | | |
| Праверка дзённікаў вучняў 4, 7 класаў | Выкананне адзіных патрабаванняў да вядзення дзённікаў | Тэматычны | Аналіз дзённікаў | Намеснік дырэктара | Інфармацыя намесніка дырэктара |
| Арганізаванае заканчэнне II чвэрці | Маніторынг працы педагагічнага саставу ўстановы па арганізаваным заканчэнні I чвэрці. Якасць і своечасовае афармленне класных журналаў, у тым ліку зводнай ведамасці ўліку вучэбнай дзйнасці і паводзін вучняў за I чвэрць | Тэматычны | Аналіз школьнай дакументацыі | Намеснік дырэктара | Інфармацыя намесніка дырэктара |
| *4. Кантроль за станам здароўя і здаровым ладам жыцця навучэнцаў* | | | | | |
| Адаптацыя навучэнцаў 1, 5 класаў | Вызначэнне ўзроўню трывожнасці: 1, 5 класы | Франтальны | Наведванне ўрокаў, назіранне | Педагог-псіхолаг | Інфармацыя педагога-поіхолага |
| Псіхалагічная гатоўнасць першакласнікаў да навучання. Вынікі адаптацыі першакласнікаў. | Дзейнасць настаўніка па арганізацыі адаптацыйнага перыяду ў 1 класе. | Франтальны | Назіранне | Кіраўнік ВМА | пасяджэнне ВМА настаўнікаў пачатковых класаў і выхавальнікаў дашкольнай адукацыі |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Умовы, створаныя для захавання ўмацавання здароўя навучэнцаў выхаванцаў дашкольных груп | Вызначэнне ўзроўню створаных умоў для захавання здароўя вучняў і выхаванцаў дашкольных груп | Франтальны | Назіранне, гутарка | Намеснік дырэктара | Інфармацыя намесніка дырэктара |
| *5. Кантроль за станам выхаваўчай работы* | | | | | |
